Cana asobnaha numaru 20 hr. Pierasyłka apłačana ryčałtam.

Nr. 2 (547). Wilnia, Paniadziełak 8 Studnia 1934 h. Hod X (XVIII).

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i literaturnaja hazeta.

Adres Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 ran. da 4 hadz. wieč.

HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.

„Bieł. KRYNICA" kaštuje na hod—4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy—1 zał. Zahranicu ŭdwaja daražej. Ceny abwiestak pawodle ŭmowy.

Старое ўмірае — новае родзіцца.

Такі ўжо закон жыцьця, што старое ўмірае, а новае родзіцца. І год стары мінуў, адышоў у вечнасьць, памёр, а наступіў малады, новы.

У жыцьці чалавека, апрача агульных законаў жыцьця, вялікае і часта рашучае мае значэньне воля і розум чалавека. Дзеля гэтага слушна робіць чалавек, калі спатыкаючы новы год, звычайна перабірае ў думках дзеі году старога, каб разважыць, што там зрабіў ён добрае, што благое і якімі шляхамі трэба кіравацца ў годзе новым, каб добрае яшчэ пабольшыць, а злое абмінуць і зьнішчыць.

Патрэба і значэньне гэткай практыкі чалавека напрашаецца ня толькі ў жыцьці людзей асабістым, але такжа — можа яшчэ больш — у жыцьці грамадзкім.

У годзе мінулым, як і ў мінулых семнаццацёх гадох, працуем мы на паросшай благім зельлем беларускай ніве. Упраўляць гэну ніву, каб добрыя плады радзіла, будзіць душу беларуса ад сьпячкі да сьведамага жыцьця нацыянальнага, сеяць зярнё роднай культуры, вучыць і заклікаць роднага сярмяжніка да дабрабыту і шчасьця, рыхтавацца да будучай народнай волі і самастойнасьці — вось у кароткіх славах нашы ідэалы, якім служым на працягу семнаццацёх гадоў.

Вось-жа пачынаючы ў новым годзе далей весьці тую-ж нашу народную працу, аглядаемся ў гады мінулыя і пытаемся, ці ня мыляемся мы, ці не разыходзімся з жыцьцём і яго вымогамі, ці нашы словы і ідэалы прыбіраюцца ў цела, ці хоць пакрысе становяцца чынам і ці тыміж дарогамі і да тыхжа ідэалаў належа йсьці нам у гэтым годзе новым?

Усё разважыўшы, здаецца, не памылімся, калі на гэтыя пытаньні, прынамсі прынцыпова, адкажам — так.

Усе нашы імкненьні і ідэалы, апёртыя на хрысьціянскай соціолёгіі, у жыцьці апошніх гадоў усяго чалавецтва, сапраўды знаходзяць апраўданьне і пацьверджаньне.

На нашых вачах цэлае мноства народаў, шаг за шагам, упорыста здабывае сабе палітычную і эканамічную незалежнасьць, дабрабыт матэр'яльны і духовы, а так-жа творыць сваю ўласную культуру. Да гэтага імкнуцца сяньня — да няўна забытыя, а цяпер ведамыя ўсяму сьвету — Каталёнцы, Баскі, Македонцы, Фляманцы, Фрызы, Лужычане, Кроаты, Словэнцы, Украінцы, Індусы і іншыя, не ўспамінаючы ўжо аб тых многіх народах, што адраджэньне сваё больш-менш давялі да канца і, карыстаючы з сусьветнай завярухі вайны і расейскай рэволюцыі, арганізаваліся ў самастойныя дзяржавы. Такі ўжо сяньня дух часу, такой ёсьць наша сучасная культура і цывілізацыя. І калі мы беларусы ідзём разам з гэтым духам сучаснасьці, дык сапраўды робім добра, бо інакш нас, як не дарослых і адстаўшых, сільнейшыя зьмятуць з аблічча зямлі, а ў найлепшым выпадку далей будуць з нас рабіць нявольнікаў, як робяць дагэтуль.

Ня мыляемся, здаецца, такжа і што да нашых ідэалаў сьцісла социяльна-эканамічных. Капіталізм — гэта ненасытная бэстыя, банкрутуе і ўступе месца грамадзкаму ладу новаму, больш справядліваму. Сьмерць капіталізму — гэта радасьць наша. Новы лад — гэта новая, лепшая будучыня Беларусі.

Не прабавалі мы так-жа вязаць лёс беларускага народу з социялізмам ці комунізмам. І не памыліліся. Гэтыя кірункі грамадзкай думкі сяньня такжа перажываюць сьмяротную хваробу і банкрутуюць дазваньня. Італія, Нямеччына, Гішпанія, С.С.Р.Р. і іншыя некаторыя краіны — дастатачны гэтага доказ.

Сяньня што раз выразьней рысуецца на паверхні грамадзкага жыцьця ідэя корпорацыёнізму, апёртага на вечных падставах хрысьціянскай навукі. Сутнасьць яго ў тым, што адзінкі аднароднай працы, ці лепш розныя станы і клясы твораць профэсыянальныя саюзы, якія лучацца ў саюз агульны дзеля абароны сваіх правоў духовых і матэрыяльных, дзеля арганізаванай працы і дзеля рэгуляцыі і падзелу пладоў працы. На гэткіх падставах будуецца сяньня слаўная Ірляндыя, Аўстрыя, а часткова і іншыя краіны. У бок хрысьціянскага корпорацыёнізму і мы кіруемся.

Старое ўмірае — новае родзіцца. І Беларусь наша родзіцца да шчасьця, волі і долі. Дай-жа, Божа, каб нарадзіны яе хутчэй адбыліся!...

Kamunikat

Centralnaha Uradu Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury

da ŭsich hurtkoŭ Instytutu.

I. Centralny Urad B.I.H.iK. z nadychodam Nowaha 1934 h. prypaminaje ŭsim swaim hurtkom ab abawiazku prysyłańnia sprawazdačy z dziejnaści za 1933 h. Sprawazdača pawinna abymać takija punkty: 1) što hurtok zrabiŭ za minuły hod (skolki było tawaryskich wiečaryn, spektaklaŭ, zborak siabroŭ hurtka, lekcyjaŭ, jak raźwiwałasia biblijateka-čytalnia, skolki hurtok pašyryŭ biełaruskaha drukawanaha słowa: hazet, knižak i h. d.; treba apisać usiu dziejnaść hurtka); 2) jaki plan pracy maje hurtok na biahučy hod, 3) padać prychod i raschod, 4) skolki hurtok maje siabraŭ, 5) jaki skład uradu hurtka (chto staršynia, skarbnik i sekretar), 6) adras kwatery hurtka, 7) chto zahadčyk biblijateki hurtka, 8) na kaho najlepš słać karespandencyju hurtka, knižki, hazety i h. p.

Sprawazdača pawinna być prysłana da 28 lutaha hetaha hodu.

II. U miesiacach studzieni—lutym pawinny być zroblenyja ahulnyja schodki siabraŭ hurtka dziela pierawybaraŭ uradu i abhawareńnia planu na budučyniu. Na takija schodki nia treba, pawodle nowych, zakonaŭ ani dazwołu, ani pawiedamleńnia palicyi, adnakaž treba, kab siabry hurtka mieli z saboju na schodcy siabroŭskija bilety. Paśla pierawybaraŭ uradu (abo paćwierdžańnia staroha ŭradu na budučy hod), treba ŭ praciahu dwuch tydniaŭ pawiedamić starastwa, padajučy imiony, proźwiščy i adrasy siabraŭ uradu (staršyni, skarbnika i sekretara).

Kali-b hurtok u praciahu paru hadoŭ nie pawiedamlaŭ starastwa ab swaim isnawańni, starastwa mahło-b hurtok zakryć za biaździejnaść (jak heta było ŭ Nawahradzkim pawiecie).

III. Pry zakładańni nowych hurtkoŭ treba pawodle nowych zakonaŭ padać zajawu ab zakładzinach hurtka nia tolki ŭ Centralu Instytutu, ale i ŭ starastwa. Zajawu hetuju najlepš pasyłać praz Centralu Instytutu, adtul možna wypisać usie patrebnyja instrukcyi i formy zajawaŭ (Wilnia, Zawalnaja 1—1).

Zakładajučy nowyja hurtki sami zakładčyki, abo paśla ŭłady hurtkoŭ, mohuć naznačać mienšyja siabroŭskija składki. Najlepš heta rabić na ahulnych sabrańniach hurtka. Hrošy treba wykarystać na papaŭnieńnie biblijatečki hurtka, na biełaruskaje drukawanaje słowa i inšyja kulturnyja abo haspadarčyja mety. Treba zaŭsiody pomnić, što hurtok biez biblijatečki padobny da arhanizmu biez mazhoŭ.

IV. Kali hurtok nia moža raźwić šyrejšaj dziejnaści, niachaj prynamsi ładzić zborki siabroŭ, niachaj zawiadzie supolnaje čytańnie hazet, niachaj daje čytać inšym, kali-b hurtok tolki hetaje rabiŭ, to ŭžo ani Centrala Instytutu, ani administracyjnyja ŭłady nia buduć mahčy zakinuć hurtku biazdziejnaść.

Pawodle dziejnaści kožnaha hurtka aceńwajecca jahonaja wartaść i wartaść tych ludziej, jakija stajać na čale hurtka. Bolej dziejnym hurtkom Centrala Instytutu budzie mieć mahčymaść u hetym hodzie wysłać knih, jak premiju, na papaŭnieńnie biblijatečki hurtka.

Centralny Urad
Bieł. Instytutu Hasp. i Kultury

Разьяданьне Таварыства Беларускае Школы.

Беларуская арганізацыя — гэта косьць у горле ворага беларускага народу. Няхай толькі заснуецца сярод працоўнага сялянства беларуская арганізацыя — гуртов Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры або Т-ва Беларускае Школы (Т.Б.Ш.), вораг — шкоднік як з пад зямлі вылезе і зьявіцца „абаронцам" пакрыўджаных, а асабліва „апякуном" беларускіх працоўных масаў. Гэтак прыкінаўшыся прыяцелем вораг-шкоднік пралазіць у арганізацыю і пачынае там сваю „работу". Мэта ворага-шкодніка ў беларускай арганізацыі такая: зьнішчыць беларускую арганізацыю, як такую, або затруціць там беларускі народны дух нейкай бязглуздай інтэрнацыянальнасьцяй. Гэткая работа пачынаецца заўсяды разьяданьнем арганізацыі, а канчаецца, як ведаем, закрыцьцём яе адміністрацыйнымі ўладамі за „нестатутовую" дзейнасьць, або і проста за „бяздзейнасьць".

Гэтак разьелі „апякуны" беларускага народу беларускую палітычную партыю „Грамаду", гэтак разьядаюць і культурна-прасьветную арганізацыю Таварыства Беларускае Школы.

Каб даведацца, што дзеецца цяпер з Т.Б.Ш., даволі прачытаць апошнія нумары „Бел. Газ." і зьмешчаныя там аткрытыя пісьмы др. Марцінчыка і нейкага Лешчынскага ды Грыгорчука і Зайкоўскага.

З гэнае пісаніны і аткрытых пісьмаў відаць, што процію беларушчыны ў Т.Б.Ш. выступаюць дзьве проціўлеглыя сілы: маскоўска-інтэрнацыянальная і польска-нацыянал-шовіністычная. Як адна, так і другая рывалізуючы між сабою стараюцца прадусім заглушыць у Т.Б.Ш. беларускае народнае пачуцьцё і давясьці гэту арганізацыю да прылады падыходу ў гушчы працоўных беларускіх масаў дзеля пашыраньня там сваіх руйнуючых уплываў. У Т.Б.Ш. знаходзіцца нямала сяброў нацыянальна сьведамых і стойкіх за беларускую народную справу. Але вось прышоў час і пачалося ў Т.Б.Ш. паляваньне на беларускіх народнікаў.

Галоўным застрэльшчыкам гэтай аблавы на беларускіх народнікаў у Т.Б.Ш. зьяўляецца „Беларуская Газэта", на бачынах каторай выступаюць проціў беларускіх народнікаў заганятыя, якія маюцца выгнаць з Т.Б.Ш. беларускі народніцкі элемэнт.

Ня думаем, што ўсе сябры Т.Б.Ш. здольны быць толькі чужацкімі служакамі і рабіць толькі тое, што загадаюць ім з „тайнага" жарала. Верым, што ў радох Т.Б.Ш. знайдуцца яшчэ людзі, якім беларуская справа дарагая і якія гэтым варожым сілам дадуць адпор.

п—к.

126019

Biblioteka

† Ant. Švehla.

Jak užo ŭ „B. Krynicy" pisałasia, 12 śniežnia 1933 h. u m-ku Hostivar kala Prahi (Čechija) pamior adzin z wydatniejšych pracaŭnikoŭ adradženskaj pary českaha narodu i niazmorany budaŭničy adrodžanaj čechasławackaj dziaržaŭnaści, Anton Švehla.

Niabožčyk byŭ sielaninam z rodu (naradz. ŭ 1875 h.) i sialanstwu astaŭsia wiernym da apošniaha ŭzdychu. Jamu, Švehle, u najbolšaj miery pawinna čechasławackaje sialanstwa ŭsim tym, što siahońnia ŭ publičnym žyćci maje, a pieradusim swajoj siłaj palityčnaj i haspadarčaj. Kudy tolki nie zasiahaŭ tworčy rozum A. Švehly, pakidaŭ pa sabie widawočny śled. To-ž nia dziwa, što pad Jahonym kiraŭnictwam palityčnaja partyja čechasławackaha sialanstwa, h. zw. respublikanskaja, stałasia ŭ adrodžanaj Čechasławaččynie najbolšaj, najsilniejšaj, a sam A. Švehla ad pačatku isnawańnia čsł. dziaržawy byŭ ministram, a paśla niaźmiennym staršyniom Rady ministraŭ.

Ale A. Švehlu cikawiła nie tolki sialanstwa swajo rodnaje — Jaho cikawiła sialanstwa naahuł i Jamu naležycca zasłuha apracawańnia prahramy mižnarodnaj sialanskaj łučnaści (agrarismus).

Palityčnaja dziejnaść adnak nia wyčerpywała celaści A. Švehly: Jon byŭ i wydatnym haspadarom. Jamu ŭ wialikaj miery ŭdziačna čechasławackaja ziemlarobskaja kooperacyja za toje, što siahońnia zajmaje taksama pieršaje miesca siarod miascowaj kooperacyi naahuł.

Śmieła možna skazać, što kali ŭ zahraničnym žyćci Čechaŭ da pierawarotu (1918 h.) i paśla jaho byŭ i jość najpapularniejšym sučasny prezydent Masaryk, dyk u žyćci ŭnutranym heta miesca naležyłasia asobie niabožčyka A. Švehly.

Tož nia dziwa dziela taho, što wiestka ab śmierci prem'jera A. Švehly žywa ŭskałychnuła ŭsim čechasławackim narodam. Na wiestku hetu składajuc pakłon pamiaci Wialikaha Syna českaj Ziamli i ŭsie tyja, pieradusim biełarusy, katorym było dana zblizka i biespasiaredna płady Jahonaj pracy bačyć i padziŭlać.

Wiečnaja pamiać!

Ad. Klimowič.

«ЗОЛАК»

орган маладой беларускай соцыялістычнай думкі. г. І. Вільня, Сьнежань, 1933 г. № 3.

Пад гэткім назовам паказаўся ў сьвет трэці нумар скромнай беларускай часопісі, друкаванай літографскім спосабам.

Часопісь гэта, як бачым з загалоўку, мае быць органам „соцыялістычнай думкі". Соцыялізм у наш час гэта звычайна тое, што марксызм. Тымчасам у гэтай часопісі гаворыцца аб нейкім соцыялізме іншым, а аб якім, — дык дабіцца гэтага з часопісі дужа трудна. Праўда, соцыялізм бяз Маркса, гэта тое, што каша бяз солі, але сяньня аб Марксе людзі штораз больш забываюцца і твораць сабе новыя соцыялізмы, як соцыялізм народны ў сосе Гітлера, як соцыялізм хрысьціянскі, як соцыялізм рэволюцыйна-народны ці эсэраўскі. Вось гэтага апошняга, здаецца, „Золак" і трымаецца, як гэта відаць з першай стацьці, пасьвячанай памяці і разам крытыцы Карла Маркса.

Другая стацьця пасьвячана „70-м угодкам беларускага соцыялістычнага друку", гэта знача — „Мужыцкай Праўдзе" К. Каліноўскага. Чаму „Золак" уважае „Муж. Праўду" соцыялістычнай — гэта ўжо яго сакрэт асабісты. Соцыялізм як такі, так званы навуковы, фактычна пачынаецца ад „капіталу" Маркса, дзе гэта тэорыя ўложана ў навуковую сыстэму. Тымчасам І том „Капіталу" вышаў у 1867 г., знача тады, калі Каліноўскі — пяць гадоў таму — ужо выдаваў „Мужыцкую Праўду". Да тагож сутнасьць соцыялізму ў тым, што ён імкнецца да скасаваньня прыватнай уласнасьці, а ў тым ліку і ўласнасьці прыватнай на зямлю, а Каліноўскі, дзеючы згодна з духам свайго часу й як аб гэтым відаць з „Мужыцкай Праўды", імкнуўся да таго, каб сялян звольніць ад паншчыны і надзяліць зямлёй на ўласнасьць. А гэта, як бачым, з соцыялізмам ня мае нічога супольнага. Не соцыялістычнай, але народна-рэволюцыйнай была „Муж. Праўда". А гэта дзьве вялікія розьніцы.

Пасьля яшчэ двух-трох — менш цікавых — артыкулікаў наступае „цікавая" хроніка.

„Золак" прытыкае „Бел. Крыніцы", чаму яна не выступае проціў „пасяганьня" Літвы на Віленшчыну і Горадзеншчыну і чаму „Бел. Крыніца" Літву называе часта незалежнай, як-бы хочучы гэтым сказаць, што ёсьць яшчэ нейкая Літва іншая, залежная.

Вось-жа, як нашы чытачы бачаць, гэты каменьчык у наш гарод характару даволі паскудненькага і нам на яго адказаць трудна і ў некаторай меры немагчыма. Мы заўсёды балюча чуем над сабой пагрозу конфіскаты, апячатаньня шрыфту і г. д. Скажам толькі агульна, што Віленшчына і Горадзеншчына, як усім ведама, належаць сяньня да Польшчы і ўрад польскі, пэўне-ж думае аб тым, як гэтыя землі ўтрымаць пры Польшчы, а калі „Золак" уважае, што ўраду ў гэтым памагчы трэба, дык няхай ён сабе гэта робіць, але няхай нам не прапануе. Факторства — гэта пераважна рэч прыкрая і паскудная.

На другую ж — так-жа з запахам „золака" нам прытычку, што да нейкай „залежнай" Літвы парадзім яму хоць крыху пацікавіцца гісторыяй нашага краю, географіяй, этнографіяй і сучасным яго палажэньнем палітычным, каб праканацца, дзе Літва незалежная, а дзе залежная.

Канчаючы сьцьвярджаем, што імкненьні нашы да дружнага і справядлівага — на падставах вольнасьці і незалежнасьці — сужыцьця, ужо ня толькі беларусоў з найбліжэйшым нам народам літоўскім і ўкраінскім, але так-жа з народам польскім і маскоўскім, — не сарвуць ніякія выпады, адкуль-бы яны не паходзілі.

Кніжнік.

Адцягваньне ўвагі.

Сьмешныя спатыкаем прытычкі ў „Бел. Газэце" пад адрэсам „Бел. Крыніцы", а яшчэ сьмяшнейшыя сялянскія пратэсты супроць нямецкага суду.

Няраз і ня два разы „Бел. Газэта" пісала, што „хадэкі" або „Бел. Крыніца" захопліваецца гітлероўскімі плянамі на ўсходзе і нават, што супрацоўнічае Б.Х.Д. з нямецкім фашызмам. А папярэдніцы „Бел. Газэты": ўсялякія „Працы" клюбы „Змаганьня" ўсьцяж прытыкамі БХД і „Бел. Крыніцы" супрацоўніцтва з „польскімі фашыстамі".

Адначасна з гэткімі прытычкамі, як клюб „Змаганьня", так і „Бел. Газэта" праводзілі і праводзяць вельмі сьмешную акцыю пратэстаў.

Мы памятаем, як сябры клюбу „Змаганьня" Крынчык і Дварчанін, на вуліцах Вільні зьбіралі падросткаў жыдкоў і рабілі „пратэсты" супроць вайны з СССР на Далёкім Усходзе. А цяпер нешта сусім падобнае праводзіць „Бел. Газэта", у якой чытаем пратэст „35 сялян" з Ваўкавышчыны з дамаганьнем апраўданьня нямецкім судом камуністаў: Дымітрава, Папова, Танева і Торглера.

Сьмешна гэта ўсё і выглядае на дзяціныя забаўкі, але робіцца гэта не бязмэтна. А робіцца на тое, каб адцягнуць у беларусаў увагу ад сапраўдных беларускіх спраў. Тут, калі робяцца прытычкі БХД і „Бел. Крыніцы" аб супрацоўніцтве з некім, дык гэта ўсё зусім падобна да крыку лоўленага злодзея, які ўцякаючы крычыць „лаві злодзея".

Адносіны БХД і „Бел. Крыніцы" да Варшавы, да Масквы і да гітлероўскага ці якога іншага Бэрліна ўсім ведамы, як ведамы і кірунак „Бел. Газэты". Аднак гэта не перашкаджае „Бел. Газэце" практыкаваць спосаб уцякаючага злодзея з крыкам „лаві злодзея," каб адцягнуць ўвагу нашага грамадзянства ад жыцьцёвых беларускіх спраў.

Зьмітрук.

Špiašajciesia wa ŭłasnym intaresie kupić „Беларускі Адрыўны Календар на 1934 г.", bo zapas ŭžo wielmi mały. Sioletni Bieł. Kalendar jość niezraŭnana lepšy ad kalendaroŭ polskich, rasiejskich i prošłahodnich biełaruskich. Cana za štuku 60 hr., z pierasyłkaj—75 hr., za 10 štuk—5 zł., za 100 štuk—45 zł. Kupić-wypisać kalendary možna z Kniharni „PAHONIA"—Wilnia, Zawalnaja 1.

Dr. St. Hrynkiewič.

Ab zaraznych chwarobach

Žyćcio čaławieka — heta biazupynnaje zmahańnie, każa Piśmo św. Praŭda hetaja abchopliwaje ŭsie mahčymyja prajawy žyćcia. Św. Piśmo maje na ŭwiecie žyćcio ŭnutranaje, duchowaje, ale nia mienšaja heta praŭda adnosna da žyćcia ciełesnaha, fizyčnaha. Čaławiek ad samych pačatkaŭ swajho isnawańnia, jašče ŭ łonie maciery, zmahajecca za mahčymaść žyćcia. Ad peŭnaha mamentu, kali źjaŭlajecca na świet, maje nawokał siabie biazlikaje mnostwa „worahaŭ," jakija nie pakidajuć jaho, pakul na zaŭsiody nie zapluščyć wočy. Pieramoha „worahaŭ" prajaŭlajecca ŭ formie chwaroby. Zmahańnia zaŭsiodnaha my najčaściej i nia bačym, wiedajem tolki, što niechta dahetul „zdarowy" ciapier zachwareŭ. Chworaść heta pieramoha „worahaŭ."

Chto-ž heta takija „worahi"? Lik ich nadta wialiki. Siańnia spyniemsia nad niekatorymi z ich.

Ahułam možam padzialić usie chwaroby na zaraznyja i niezaraznyja. Ab niezaraznych pakul što hawaryć nia budziem. Wiedaje kožny z nas, jakaja rožnica pamiž adnymi i druhimi chwarobami. Najbolš charakternaju swomaściu zaraznych chwarobaŭ budzie toje, što jany hetak ci inakš pierachodziać z adnych ludziej na druhich. Daŭno ŭžo było wiedama, što kali niedzie łučyła čuma, wospa, tyfus sypny, brušny ci pawarotny ci na't prosta najbolš wiadomy i raspaŭsiudžany katar, dyk nikoli nia spyniałasia chworaść na adnym čaławieku, a abchopliwała bolšyja ci mienšyja hramady ludziej, wioski, krainy ci na't staronki świetu. Lehendy chodziać pa najbolš hłuchich wioskach ab tym, jak kali wymirali cełyja harady na mor, šmat chto z nas bačyŭ i pomnić niadaŭniuju epidemiju „hišpanki"; wiedali ŭžo daŭno, što možna było abaranicca ad zarazy, aścierahajučysia ludzkich znosinaŭ z chworym čaławiekam, dbajučy ab čyściniu, palačy wopratku, chuścio i paściel chworaha i h. d. Adnak čamu rupliwaja dbajłaść ab čyściniu adnamu pamahała, a druhomu nie—zusim wyjaśniłasia tolki niadaŭna, niedzie kala pałowy minuŭšaha stahodździa. Sumlennyja i ŭporystyja dośledy ludziej nawuki, takich jak Pasteur (Francuz), Koch (Niemiec) i świet inšych wyjawili, što pryčynaju zaraznych chwarobaŭ źjaŭlajucca malusieńkija žywyja istoty, jakich nia bačym wokam biez padmohi adumysłowych pryładaŭ—mikraskopaŭ; henyja małyja žywioliny naležać najčaściej da hrupy hrybkawidnych, pleśniepadobnych, niaruchliwych raślin. Dziela taho, što henych žywiolinaŭ prostym wokam nia bačym, nazywajem ich: mikroarhanizmami (ad hreckaha słowa mikros—mały), abo jašče čaściej nazywajuć ich prosta bakteryjami. Dyk wyklikalnikami zaraznych chwarobaŭ buduć roznajakija bakteryi; zachacieŭšy pahladzieć takuju, treba karystacca pawialičwajučymi pryładami — mikroskopami. Mikroskop moža pawialičyć u 500, 1000 i bolš razoŭ. Bakteryi daloka nieadnolkawyja, tak jak nieadnolkawyja pamiž saboju i ludzi. Rožnica pamiž henymi žywiolinami i z boku wyhladu wonkawaha i z boku roznajakaści chwarobaŭ, jakija jany wyklikajuć, nadta wialikija; adnyja bakteryi wyklikajuć wospu, i inšyja tolki kokluš i bolš ničoha, jašče inšyja tyfus sypny, a inšyja pawarotny ci brušny i h. d. Z wonkawaha wyhladu bačym kruhleńkija, haławaściki, wužakawatyja i h.d.

Bakteryi nazwaŭ ja žywiolinami; što jany žywuć, pakazwaje chacia-b toje, što jany ruchajucca, pierachodziać z miesca na miesca, što jany rastuć i płodziacca. Dziela taho kab raści i pładzicca, patrebnyja im peŭnyja ŭmowy. Takija ŭmowy majuć prykładam u ciele čaławieka. Sonka im najčaściej niepatrebnaje, a biez wady nia mohuć žyć. Dzie sucha i šmat sonka i pawietra—rastuć jany nadta błaha. Zhetul wywad praktyčny—kali chočaš, kab nawokał ciabie było najmienš bakteryjaŭ, dyk dbaj ab suchoje, poŭnaje sonka i pawietra pamieškańnie. Čym bolš u chacie woknaŭ na poŭdzień, čym henyja wokny wialikšyja, tym bolšaja peŭnaść, što tamaka mienšaja niebiaśpieka zaraznych chwarobaŭ.

Bakteryi rastuć nadta chutka. Bakteryi ŭ formie karocieńkaj pałački dzielacca (značycca z adnaje robicca dźwie i kožnaja žywie zusim asobna) kožnaj $1/2$ hadziny. Dyk z adnaje bakteryi za $1/2$ hadziny budzie dźwie, za hadz. 4, za dźwie hadziny 16, a za 24 hadzin budzie ich miljony. Žywioliny henyja na hetulki maleńkija, što ŭ zierniaci maku možna ich pasadzić niekalki dziesiatkaŭ miljonaŭ.

Nia ŭsie bakteryi roŭna niebiaśpiečnyja. Bakteryja, jakaja wyklikaje katar, mienš strašnaja za bakteryju ad zapaleńnia lohkich, dyfterytu ci tyfusu. Nia ŭsie bakteryi wyklikajuć chwaroby. U kožnaha čaławieka biez kanca ich u rocie, na skury, u strawatraŭčym prachodzie, ale ŭ normalnych umowach jany dla nas zusim niaškodnyja. Jość na't bakteryi, dziejnaść jakich karysnaja dla čaławieka, prykładam bakteryi, ad prysutnaści jakich kiśnie małako, ahurki, kapusta, chleb, abo znoŭ tyja bakteryi, jakija papraŭlajuć ziamlu, robiać jaje bolš uradžajliwaju, jak prykładam tyja bakteryi, što siadziać na kareńniach łubinu, seradeli i pryciahwajuć z pawietra azot.

Nažal kolkaść karysnych bakteryjaŭ niewialikaja. Šmat bolš tych, jakija wyklikajuć chwaroby. Najčaściejšyja chwaroby zaraznyja ŭ nas buduć woś jakija: chwaroby weneryčnyja (syfilis, tryper), suchoty, tyfus brušny, krywaŭka abo dezynteryja, chalera, škarlatyna, dyfteryja, wospa, adrioz (wodra), tyfus sypny, zapaleńnie mazhawych bałonaŭ (meninhit), ehipskaje zapaleńnie wočaŭ—trachoma, staŭbniak, sap, ašaleńnie, wuhlanka i h. d.

U zarazna chworaha rastuć u roznych orhanach cieła bakteryi i raspaŭsiudžwajucca ŭ ich, pierachodziačy abo prosta na zdarowych dahetul ludziej, abo wykarystoŭwajučy inšyja žywioły, prykładam wošy ŭ sypnym tyfusie, dzie woš usmaktywaje bakteryi, pjučy kroŭ chworaha, a potym pieranosić ich zdarowamu, kali pačnie jaho kusać.

Tyja bakteryi, jakija pierachodziać prosta z čaławieka na čaławieka, karystajucca roznymi šlachami, prykładam bakteryja suchotaŭ najčaściej traplaje ad chworaha da nowaha haspadara praz kropli śliny; brušnym tyfusam, krywaŭkaju, chaleraju zaražajemsia z niačystotaŭ chworaha i h. d. Pakul pamiž nami jość zarazany chwory, datul niebiaśpieka, što my zachwarejem, kali nia budziem baranicca jak treba. U medycynie jość asobny addzieł, cełaja halina wiedy, jakaja maje na ŭwiecie zmahańnie z zaraznymi chwarobami. Heta zmahańnie — nie dapuścić, kab zaraza pajawiłasia (hetym zajmajecca adčaści nawuka—hygijena), a kali i pajawicca, dyk nie dapuścić da raspaŭsiudžwańnia i wylekawać zachwareŭšaha.

БЕЛАРУСКАЯ ХРОНІКА.

Праваслаўная Камісія Б. Н. К. у арх. Хвядоса. Прэзыдыум Праваслаўнае Камісіі пры Б.Н.К. дня 26 сьнежня 1933 г. быў прыняты афіцыяльна Віленскім архіепіскапам Хвядосам. Прэзыдыюм паведаміў архіепіскапа аб мэтах паўстаньня Прав. Камісіі і аб яе працы, аднача сна просячы прысьпяшыць справу беларусізацыі Царквы і зарэагаваць на выступленьні некаторых сьвяшчэньнікаў, абражаючых нацыянальныя пачуцьці прав. беларусаў. Арх. Хвядос, прыняўшы пад увагу мэты Камісіі, даў сваё багаслаўленьне сябром Камісіі і працы яе, запэўняючы, што справа беларусізацыі царкоўнага жыцьця паступова рэалізуецца. Адносна выступленьняў некаторых сьвяшчэньнікаў, абражаючых сваіх пасомых, архіепіскап абяцаў, што рашуча будзе з гэтым змагацца, хай толькі самы-ж прыхаджане аб такіх выступленьнях у свой час паведамляюць Эпарх. Кіраўніцтва.

Кансысторскае сьледзтва за зьнявагу беларускай мовы. У зьвязку з зробленымі сьвяшч. Дэрынгу закідамі, што ён на благачыньніцкім зьездзе назваў мову беларускую „хамскай“ і «мужыцкай,“ Віл. Дух. Кансысторыя прыступіла да пазнаньня гэтае справы. Быў скліканы экстэрны зьезд духаўнікоў таго-ж Докшычкага благачыньня, на якім і праведзена сьледзтва. Справа гэная, як даведваемся, у хуткім часе мае быць закончана.

Спатканьне Новага Году. Віленскія беларусы сёлета супольна спатыкалі Новы Год вельмі ўрачыста. Гэнае спатканьне адбылося ў залі Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры (Завальная 1—1), дзе прысутныя пры супольным стале дзяліліся думкамі. Пажадана, каб падобныя таварыскія зборкі адбываліся часьцей.

З выдавецкае нівы. У канцы мінулага году вышла з друку новая беларуская кніжыца п. н. „**Ameryka ŭ łaźni**,“ камэдыя ў трох дзеях Кетуракіса. Кніжыца гэта каштуе 40 гр. Купіць-выпісаць можна з Бел. Кнігарні „Пагоня“ Вільня, Завальная 1—1.

Зьдзек маскалёў над беларусамі.

Нядаўна адбыліся благачынскія зьезды: дзісенскага, друйскага і докшыцкага благачыньня дзеля выбараў дэлегатаў на віленскі эпархіяльны зьезд. На гэтых зьездах выявілі айцы цікавыя настроі да беларусаў.

Праваслаўнае духавенства на гэтых зьездах высказалася проціў увядзеньня беларускае мовы ў царкву і ў мэтрыкі, цьвердзячы, што наш народ гаворыць па расейску.

А вось і другая вестка. Віленская праваслаўная Кансысторыя загадала, каб мэтрыкі былі пісаны побач з мовай польскай і пабеларуску, замест, як было дагэтуль,—парасейску. Загад гэты не ўспадобу частцы расейскага духавенства і віленскім псаломшчыкам, якія пастанавілі не дапушчаць да пісаньня мэтрыкаў пабеларуску.

Чытаючы гэткія весткі, кожны праваслаўны беларус засароміцца за сваё праваслаўнае духавенства.

Хто пільна сочыць за жыцьцём нашае Царквы на беларускіх землях, той ня можа не заўважыць проста страшнага заняпаду нашага царкоўнага жыцьця, а шукаючы прычын, мусіць згадзіцца, што найгалаўнейшай ёсьць дзейнасьць расейскага духавенства, якое ня толькі ня хоча зразумець, што роля яго гэта быць запраўднымі душпастырамі ў беларускім народзе. Расейскаму духавенству яшчэ сьніцца роля сьвяшчэньніка-абрусіцеля, а дзякуючы гэтаму вернікі беларусы ўсё болей ды болей адыходзяць ад Царквы. Прыгледзьмася, што робіцца з нашай моладзьдзю на вёсцы; ці часта бывае яна ў царкве? Не! А чаму? Бо расейскі сьвяшчэньнік ня хоча да моладзі прыблізіцца і пагаварыць з ёй у роднай мове, як ў царкве так і ў жыцьці агулам.

І калі наша моладзь сяньня адрываецца ад Царквы і нат' ідзе ў камунізм, то гэта заслуга расейскага духавенства і такіх місіянэраў чорнасоценцаў, як а. а. Рагальскія, Балаі і шмат др.

Беларускае праваслаўнае насельніцтва перастае быць этнографічнай масай дзеля пераробкі на маскалёў, а вымагае жыцьця рэлігійнага і народнага. Аб гэтым духоўныя пастыры павінны ведаць, інакш, дык можа выйсьці, што пастыры застануцца без авец. Мы яшчэ верым, што Мітраполія зразумее палажэньне і ўложыць у рамкі раз выдраную на нашых землях расейшчыну. Мы верым, што вышэйшая дух. улада гэта зробіць і не дапусьціць, каб голас беларускае праваслаўнае крыўды дайшоў да ведама Патрыярха ў Канстантынопалі і да іншых Аўтокефальных Цэркваў.

Іван Міранові́ч.

Ukraina i Biełaruś u miżnarodnaj palitycy.

Żydoŭskaja hazeta „Moment“ padaje wiestki z Maskwy, što sawieckija palityčnyja kruhi zaniepakojeny staćcioj anhlijskaj hazety „Dejly Mejl,“ jakaja zaklikaje da wajennaha sajuzu Niamieččynu z Anhlijaj i da padtrymańnia planaŭ Hitlera. A hetyja plany miž inšym palahajuć na adarwańni Ukrainy i Biełarusi ad SSRR. Anhlijskaja hazeta dakazwaje, što ŭ hety wajenny sajuz pawinna być uciahniena Francyja i Polšča. Za mahčymaść niamieckaj kolonizacyi na prastorach Ukrainy i Biełarusi, Niamieččyna zrakłasia-b swaich pretensyjaŭ da Pamorra i Paznanščyny, a tak-ža i da Rurskaha basejnu. Polšča dastała-b čaść Ukrainy z Adesaj, hałoŭnaje z adeskim portam.

Słowam, tarhujuć krainami ahułam i paasobku, jakija nie zdaleli jašče zdabyć samastojnaści.

Uzrost nacyjanalizmu ŭ Sawiec. Biełarusi

kamunistyčnaja z im baraćba.

Pawodle aficyjalnych wiestak, u Sawieckaj Biełarusi, paśla prawiedzienaj apošnimi dniami „čystki“ ŭ kamunistyčnaj partyi, wykinutych z hetaj partyi kala 10.000 asob. A ŭsia kampartyja BSRR. naličwała prad hetym kala 50 tysiač siabroŭ. Wykinutym z kompartyi stawiać za winu nacyjanalnaje pačućcio. U wadnym tolki Miensku z liku 10.103 kamunistaŭ za nacyjanalizm wyhnanych z partyi 1185 asob 867 pakinutych ŭ kandydatach, a 500 asobaŭ zaličanych sympatykami kamunizmu. Słowam, nacyjalizm raście i pustošyć rady kompartyi.

Dwarčanin „škodnik“ Sawieckaj Biełarusi.

Z apošniaha numaru „Бел. Газ.“ dawiedwajemsia, što b. pasoł klubu „Змаганьне“ d-r J. Dwarčanin, jaki paśla zasudžańnia jaho polskim sudom u Wilni na 8 hadoŭ katarhi za prociŭdziaržaŭnuju dziejnaść pajechaŭ u Sawiety, ciapier u Miensku „wykryty“ jak aktyŭny škodnik Sawieckaj Biełarusi i jak „wiadomy worah nacyjanalna-wyzwalenčaha ruchu ŭ Zach. Biełarusi.“ Słowam, Dwarčanin, jaki budučy ŭ Zach. Biełarusi źjaŭlaŭsia adnym z kitoŭ sawietafilskaj palityki siarod biełarusaŭ, u Sawietach za biełaruščynu pastaŭleny ŭžo ŭ kandydaty na Sałoŭki.

Suproć Dwarčanina ŭžo wostra wystupiła i „Беларуская Газэта,“ jakaja paśla wyjezdu Dwarčanina i kumpanii ŭ Sawiety zaniała pa ich aparožnienaje miejsca dy pačała tak-ža zachopliwać biełarusaŭ sawieckimi „достиженіями“, ab jakich zaŭsiody i ŭsiudy hawaryŭ i Dwarčanin.

Prysud śmierci za padpał Rejchstahu

ŭ Niamieččynie.

U Lajpcihu praz try miesiacy adbywaŭsia sud za padpał niamieckaha parlamantu (Rejchstahu). Sudzili kamunistaŭ: Torglera, Dymitrawa, Popowa, Tanewa i Lubbe. Dnia 23 śnieżnia 1933 h. hety praces zakončyŭsia prysudam Lubbe na karu śmierci i apraŭdańniem inšych.

U matywach prysudu miž inšym skazana, što padpał Rejchstahu maje značeńnie wyrazna palityčnaje, bo mieŭ być dla kamunizmu syhnałam rewalucyi.

Hazety padajuć, što Torglera z inšymi kamunistami buduć jašče raz sudzić u inšaj sprawie za dziaržaŭnuju zdradu, a baŭharaŭ: Dymitrawa, Popawa i Tanewa wysielać z Niamieččyny.

Kanfiskata „Bieł. Krynicy“

Pa zahadu dziaržaŭnaj administracyjnaj ułady „Biełaruskaja Krynica“ Nr. 1 z dataj 7 studnia 1934 h. skanfiskawana za staćciu „Biełaruskaje žyćcio za 1933 hod“.

Strašnaja čyhunačnaja katastrofa ŭ Francyi.

U subotu 23.XII. na st. Langny, kala Paryža zdarylasia, strašnaja čyhunačnaja katastrofa, jakoj nia było jašče wa ŭsim świecie ad pačatku jazdy čyhunkaj. Kurjerski ciahnik poŭnym chodam najechaŭ na ciahnik ekspres. U wyniku hetaha spatkańnia ciahnikoŭ paŭstali kamy žaleza; amal usie wahony raźbityja. Pad zwałami wahonaŭ 217 asob zabitych i bolš 300 ranienych. Ciažka ranienych pamiaścili ŭ špitali ŭ Legny, a lahčej ranienych pierawieźli ŭ Paryž. Prywieźli ŭ Paryž i zabitych, jakich prychodzili paznawać swajaki i znajomyja. Padčas hetaha raspaznawańnia zdaralisia wielmi trahičnyja sceny. Hetaj katastrofaj uzwarušena usia Francyja. Pryčyna katastrofy dakładna nia wyjaśniena; dakazwajuć, što zdarylasia z pryčyny hustoj imhły, jakaja nie dała spaściarahčy syhnałaŭ.

Zabojstwa rumynska premjera.

U Sinai, kala Bukareštu ŭ Rumynii 29.XII.1933 h. dakanany zbrojny napad na premjera rumynskaha ŭradu Duka, katoraha napaśnik wystrełami z rewalweru zabiŭ na miejscy. Zabojca źjaŭlajecca student rumynskaj nacyjanalistyčnaj arhanizacyi „Žaleznaj Hwardyi“ M. Konstantiniesku.

Piśmy z wioski.

Ab našaj komasacyi.

Sakałojci, kala Gierwiat, Wil.-Trockaha paw. Apošnimi časami prawiedziena ŭ nas komasacyja. Ciapier, jak razhladzielisia našy sialanie, dyk prosta plujuć na jaje. A pryčyna woś u čym. Rabiłasia ŭsio pa kazionnamu, a kamisija, što caniła ziamlu, nia wiedała, jak treba rabić. Dyk z usiaho wyjšaŭ pšyk. Chutary niaroŭnyja, bo wuzkija i doŭhija, nawat i darohi nie dahodnyja. Ahułam kažučy, chutary ŭ nas nie ŭdalisia.

Dyk woś što značyć zdacca na niečuju łasku, — zatoje ciapier niawyhoda i niezdawoleńnie. Kab ab hetaj sprawie sialanie cikawilisia bolš prad komasacyjaj, napeŭna lepš było b. Dyk niachaj heta budzie dla druhich nawukaj.

Chutarščyk.

Hop — socyjalisty i hura radykały.

(*Piśmo z Brasłaŭščyny*).

Jašče niama troch hadoŭ, jak ja wypisaŭ u swaju wakolicu „Bieł. Krynicu“ i pačaŭ z joj uświedamlać našych sialan, a pradusim moładź. Za hety čas mnoha starejšych i moładzi narodna ŭświedamilisia i wyrabilisia na dobrych biełaruskich patryjotaŭ. Aproč hetaha, chłopcy parazumnieli i wyrabili šyrejšy kruhazor žyćciowy. Ale nia ŭsie, bo jość ludzi i z pryrody tupyja, ahraničanyja i biaskrytyčnyja. Hetaja katehoryja ludziej sama mała dumaje i zdarowa dumać nia ŭmieje; achwotna prymaje nawinki, choć jany i ŭstarełyja ŭ świecie, i ŭważaje za najrazumniejšaje ŭsio toje, što niezrazumiełaje ani jamu, ani takim jak jon, dy ab čym i nia ŭsie wiedajuć. Woś hetkaj katehoryi moładź našaj wakolicy niedzie pačuje ab socyjaliźmie i ŭžo nazywaje siabie „socyjalistymi“. A socyjalizm u paniaćci hetaj moładzi palahaje na nienawiści da zamažniejšych ludziej, biezrelihijnaści i hrubijanstwie ŭ adnosinach da duchawienstwa, da starejšych i nanialubaści idejnych ludziej. Hetyja hop-socyjalisty starajucca być i hura-radykałami, a radykalizm, pawodle ich paniaćcia, zaklučajecca ŭ łajancy ŭsich i ŭsiaho i ŭ chwaleńni bałšawikoŭ.

Na moj pohlad hetyja hop-socyjalisty i hura-redykały — heta źjawišča nienarmalnaha raźwićcia našaj moładzi, jakaja raście, jak kažuć, na les hledziačy, biez nijakaha wychawańnia, ani chatniaha, ani hramadzkaha.

Treba pašyrać swaju biełaruskuju arhanizacyju i ŭ joj hadawać darosłuju moładź, bo inakš, dyk hety hop-socyjalizm i hura-radykalizm susim raźješć našu moładź.

Adkryty.

Treba baranicca ad polonizacyi.

Mur.-Ašmianka, Ašmianskaha pawietu. U našym miastečku jość škoła, ale polskaja. U joj dwuch wučycialoŭ i adna wučycielka. Usie jany palaki. Ksiondz u nas taksama pracuje nia mała dla polščyny, zakładajučy „koły“ „St. Mł. Polskiej“.

Hledziačy na ŭsio heta, prosta žal, što z usich bakoŭ imknieńnie wynaradawić biełarusaŭ. Para ŭžo našaj sialanskaj moładzi ŭsio heta paznać. Para bracca za swaju biełaruskuju rabotu. Treba čytać swaje biełaruskija knihi i hazety, dyk čužackija ŭpływy nas nie aputajuć.

Toj Sam.

Roznyja wiestki.

Z POLŠČY.

Uzrost pratestaŭ weksaloŭ. U listapadzie 1933 h. wa ŭsiej Polščy zapratestawana 135,5 tys. weksaloŭ na sumu 28,2 miljonaŭ zł.

Abnizili taryfu. Ad 1 h. m-ca abnizili apłatu za prajezd čyhunkaj na piatuju čaść dasiulešniaj cany. Adnak heta źnižka dajecca tolki tady, kali pasažyr jedzie dalej jak 35 kilam. Abnizili tak-ža i apłatu paštowuju za piśmy, ale tolki žaŭnieram.

Manifest bieraściejskich wiaźniaŭ. Polskija hazety padajuć, što Witos, d-r Kiernik, Bagiński i d r Liberman, jakija paśla zasudu ich wyjechali ŭ Čechasławacyju, tam ciapier apublikawali manifest, u jakim wyjaśniajuć, čamu wyjechali zahranicu.

Čamu patanieli nici. U Polščy pačałasia zajadłaja konkurencyja miž polskimi i rasiejskimi nićmi. Špiarša balšawiki pradawali nici ŭ Polščy pa 12 zł. za tuzin 1000 metrowych kačułak, a polskija kaštawali 14 zł. Ciapier polskija fabryki abnizili canu na 10 zł., a balšawiki na 9 zł.

Palityčnyja pierahawory biez kanca. Apošnimi časami adbywalisia jakijaś ważnyja palityčnyja pierahawory miž wialikimi dziaržawami. Francuskija pradstaŭniki hawaryli z niamieckim Hitleram, hawaryli z Hitleram i pradstaŭniki Anhlii. Pradstaŭnik SSRR Litwinoŭ hawaryŭ u Maskwie z pradstaŭnikom Niamieččyny Nadolnym. Ab čym hawaryli, amal nia wiedama. Wiedama tolki, što Francyja choča pahadzicca z Niamieččynaj.

Z ZAHRANICY.

Razwał Małoj Antanty. Hazety padajuć, što Juhasławija maje wystupić z abozu francuskaha kiraŭnictwa, bo Niamieččyna byccam abiacaje dla Juhasławii čaść Karyntyi, a paśla maje złučycca z Niamieččynaj Aŭstryja.

Zabili arcybiskupa ŭ Cerkwie. U Niu-Jorku ŭ časie Kalad padčas nabaženstwa, jakoje adpraŭlaŭ arcybiskup katalicka-armianskaj Cerkwy ŭ Amerycy a. Turjan, u mament, kali jon z pracesijaj wychodziŭ da aŭtara, z natoŭpu narodu kinulisia na arcybiskupa 4 maładyja mužčyny i zarezali jaho nažami. Napaśniki aryštawany i pryznalisia, što jany armianskija nacyjanalisty i ŭważajuć palityčnuju dziejnaść arcyb. Turjana wielmi škodnaj dla armianskaj nacyi.

Śmierć prezydenta Katalonii. 24.XII. 1933 h. u Barcelonie pamior prezydent Katalonskaj respubliki Fr. Macia. Niabožčyk praz usio žyćcio zmahaŭsia za wyzwaleńnie Katalonii, a za heta wielmi słyŭ i sływie ŭ nanarodzie. U pachowinach Macia brała ŭčaście 300.000 narodu.

Śmierć Łunačarskaha. U darozie ŭ Madryt pamior hetymi dniami b. kamisar aświety SSRR Anatol Łunačarski, jaki byŭ naznačany na ambasadara ŭ Madryt i jechaŭ tudy z Maskwy.

Sawiety chočuć ustupić u Lihu Narodaŭ. Hazety padajuć, što Sawiety starajucca ŭstupić u Lihu Narodaŭ. Aficyjalnyja sawieckija čynniki hetaj wiestki nie zapiarečywajuć. Słowam, balšawiki pryłabuniwajucca da eŭrapejskaj buržuazii.

Japonska-Sawiecki kanflikt pahłyblajecca. Anhlijskija hazety padajuć, što ŭ Charbinie mandžurskija ŭłady aryštawali 25 asob sawieckich čynoŭnikaŭ, winawaciačy ich u špijonstwie. Z hetaj pryčyny ŭ Maskwie adbyłasia wajennaja narada i pastanoŭlena prystupić da represijaŭ; u Sibiry aryštawali balšawiki 25 asob mandžurskich hramadzian. Usie jany abjaŭleny założnikami i buduć rastrelany, kali ŭ Charbinie rastralajuć sawieckich čynoŭnikaŭ.

Balšawickija ździeki. Adna Amerokanskaja hazeta nadrukawała karespandencyju z Paryža ab haścinach min. Erio ŭ Sawietach i jak jon adwiedaŭ adnu carkwu ŭ Maskwie. Wyjawiłasia, što nabaženstwa, na jakoje pryšoŭ Erio, adprawiŭ čekist, pieraadzieŭšysia za prawasłaŭnaha świaščeńnika. Sabraŭšysia wierniki byli taksama siabrami G.P.U. Świaščeńnik i dziak, adziety ŭ bahatyja liturhičnyja ryzy biaz sumniwu byli žydki. Wyjawiłasia heta tamu, bo adzin z prysutnych u carkwie z francuzaŭ, jaki zapadozryŭ „świaščeńnika“, paśla taho, jak Erio i jaho akružajučyja wyšli z nabaženstwa, nieŭspadzieŭki wiarnuŭsia ŭ carkwu. U carkwie „świaščeńnik“, što prad chwilinaj adpraŭlaŭ „nabaženstwa“, abapioršysia ab aŭtar, kuryŭ papiarosu, a „wierniki“ ŭ dzikich padskokach z radaści tancawali ŭ carkwie. Pabačyŭšy heta, francuz niezamietna wyjšaŭ z cerkwy.

„Діло“ 30.XII.1933.

Zima. Ciažkaja sioletniaja zima ŭsiudy. U Anhlii zamierzła woziera, jakoje nie zamierzała ad 1895 hodu.

Z Wilni.

U pamiać ks. praf. Kraŭjalisa 2 h. m. u zali litoŭskaj himnazii Witaŭta Wialikaha adbyłasia akademija. Referat pračytaŭ ks. Čybiras, a paśla referatu adbyŭsia kancert.

Kanfiskata. „Przegląd Wileński“ Nr. 22 z 31 XII. 1933 h. za stačciu, abhawarwajučuju 15-lećcie sprawy Wilenskaj, skanfiskawany.

Trymajecca maskoŭščyny. Nastajaciel Carkwy ŭ Trokach, mitraforny pratajerej Kłopski, nie žadajučy wykładać u škołach Zakon Božy inakš, jak parasiejsku, admowiŭsia ad pracy ŭ škołach i nie chadziŭ na lekcyi. Wil. Duch. Kansystoryja, dawiedaŭšysia ab hetym, pieraniesła jaho ŭzaštat, h. zn. pazbawiła jaho nastajacielstwa Trockaje Carkwy.

Hałodnyja dzieci. Prawiedziena školnymi ŭładami ankieta wyjawiła, što ŭ Wilni kala 10 pracentaŭ dziaciej prychodzić u školu naščа i nia maje čaho jeści.

Biezraboćcie. U kancy śnieżnia m. h. ŭ Wilni i Wilenščynie było aficyjalna zarejestrawanych 6980 biezrabotnych. Z hetaha liku kala 2000 atrymliwaje zapamohi hrašowyja i ŭ natury.

Upadak promysłu i handlu. U źwiazku z wykupliwańniem pramysłowych patentaŭ na 1934 hod, Pramysłowy Urad m. Wilni atrymliwaje zajawy zračeńnia pradpryjemstwaŭ pramysłowych, handlowych i ramieślanych. Najbolš likwidujecca pradpryjemstwaŭ handlowych. Na Nowy Hod źlikwidawałasia kala 100 kramaŭ.

UWAHA! PREMIJA DLA PADPIŠČYKAŬ „BIEŁ. KRYNICY“

Chto pryšle padpisku na „Biełaruskuju Krynicu“ na 1934 hod da 25 studnia s. h. ŭ sumie 6 zł., atrymaje:
В. Ластоўскага: ГІСТОРЫЮ БЕЛАРУСКАЙ (КРЫЎСКАЙ) КНІГІ.
Chto pryšle padpisku ŭ sumie 4 zł. i 50 hr. da 1.III.34, atrymaje 5 knižak:
1) **Новая Зямля** i 2) **Сымон музыка** — *Якуба Коласа.*
3) **Z Rodnaha zahonu** — *Andreja Ziaziuli.*
4) **Kaniok Harbuniok** — *W. A.*
5) **Ziemlarobskaja čytanka.** — *inž. Ad. Klimoviča.*
Wypiswajcie adresujučy: Red. „Bieł. Krynicy“ Wilno, ul. Zawalna 1—1.

Z kraju.

Pahroza hoładu. Letašni ŭradžaj u niekatorych miajscoch našaha Kraju nie wiarnuŭ nawat nasieńnia. Pahroza hoładu adrazu stała prad wačyma. Treba ratawać ludziej ad hoładu. Hazety padajuć, što hetymi dniami maje nadyjści da Wilni i inšych miestaŭ Kraju niekalka transpartaŭ zbožža, bulby i inšych praduktaŭ dla nieŭradžajnych miajscoŭ i biezrabotnych? Ale za što hetyja ludzi kupiać zbožža i inšyja pradukty. Tut patrebna šyrejšaja pomač.

Likwidacyja Wilenskaha Ziemlarobskaha Uradu. Ad 1 h. m. Wilenski Akružny Ziamielny Urad źlikwidawany, a na jaho miejsca paŭstaje Wajawodzki Addzieł Ziemlarobstwa i Reformy Rolnaj. U sprawach datyčačych upierad Ziamielnaha Uradu, treba źwiartacca ŭ Wajawodzki Addzieł Ziemlarob. i Refor. Rolnaj.

Tak-ža ab likwidacyi. Chodziać čutki, što Waršaŭskaja Prawasłaŭnaja Mitrapolija maje źlikwidawać Horadzienskuju eparchiju, dzielačy jaje terytoryju miž Pinskaj, Wilenskaj i Chołmskaj eparchijami.

Strašnaja siamiejnaja trahedyja. U wioscy Trojanowo, Niaświskaha paw. J. Mlečaroŭ załawiŭ swaju žonku... z susiedam Jusolskim i aboich zarubaŭ siakieraj. Na kryk nadbieh susied Laśnieŭka, jakoha Mlečaroŭ tak-ža zarubaŭ. Paśla ŭsiaho Mlečaroŭ padpaliŭ chatu z trupami, a sam z siakieraj pašoŭ u les.

Marozy wyhaniajuć dzikich świniej z lasoŭ. Adusiul nadychodziać wiestki, što dzikija świni robiać mnoha škody: ryjuć zasieŭ žyta, pierawažna bulbowišča, a tak ža kapcy-schowy bulby. U adnej miajscowaści sielanin wystraliŭ u dzika, ale tolki raniŭ Ranieny dzik napaŭ na sielanina i raździor jaho na śmierć.

Naša Pošta.

Wiaršynin M. Atrymali, dziakujem, karystajem, pišycie čaściej, kali pazwalaje Wam čas.

Špak. Trafna Wy źwiarnuli ŭwahu na wybary. Z karespandencyi skarystali ahulna, bo ab wybarach nia nadta možna było šyroka pisać i miejsca ŭ hazecie mała, a pišuć z siała ab usim mnoha, dyk treba pa krysie drukawać. Pišycie, pa mahčymaści budziem drukawać. Pazdraŭlajem i Was z Światkami

Kuk. Atrymali, dziakujem, skaraciŭšy nadrukujem. Sladzicie za wybarami hminaj Rady i apišycie, ale koratka.

Bužanski. Dziakujem, skarystajem. Kali Wam nia ŭ trud, dyk pišycie čaściej, achwotna wašy rukapisy drukujem.

M Manieŭski. Pa atrymańni 10.50 zł. wyšlem dźwie premii i na 4 zł. bieł. knižak, jakija ŭžo atrymali.

Siehien Jan. U sprswie swajho doŭhu źwiarniciesia u het.zw. Sud razjemčy; pytajcie hetkaha sudu ŭ pawiecie.

B. Dudka. Hazetu Wam i Karnat. pasyłajem. Ab datrymańni nami sakretu aŭtorstwa stačciej niama i hutarki — da hetaha sakretu zabawiazwaje nas mnohaje; sudowyja ŭłady nie narušajuć hetych zabawiazaniaŭ.

Adkryty. Atrymali, skarystajem, dziakujem, pišycie bolš. Adnosna hazety sprawa hetak wyhladaje: my służym nia čužoj sprawie, a swajoj sprawie biełaruskaj, dyk i pišam usiebakowa i ab usim. U sprawie relihijnaj pišam, bo treba z carkwy wyhnać maskoŭščynu, a z kaścioła polščynu. Kamu biełaruski narod nie abchodzić, a tolki čužyja sprawy, toj biełarusaŭ ad čužackich spraŭ nie baronić, a my baranić musim. I nam nie należyć da pryjemnaści ahryzacca z polskimi i maskoŭskimi biskupami, adnak ab sprawach relihijnych pišam, bo wymahaje hetaha interas Biełaruskaha narodu. Što datyča hura-socyjalistaŭ, dyk heta časowaja chwaroba mała idejnaj moładzi; dažywuć da 30 hadoŭ, dy jašče aženiacca, dyk ustatkujucca i buduć narmalnymi ludźmi jak i ŭsie.

Miluć Al. Wierš prysłany nam pieradali ŭ časopiś „Šlach Moładzi.“ Radzim Wam lepš pisać u hazetu karespandencyi ab žyćci ŭ Wašaj wakolicy.

Damuć. Hazetu pasyłać budziem, čytajcie, pašyrajcie i druhich zaachwočwajcie, z karaspandencyi skarystajem, pišycie čaściej.

Redaktar: Jan Paźniak
Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1 — 3.
Wydawiec: A. Šutowič